**Дзяржаўная ўстанова адукацыі**
**“Дварэцкая сярэдняя школа”**

# Аглядавая інфармацыйная гадзіна

# "Падзеі, факты, каментарыі»

(10 клас)

Падрыхтавала:
класны кіраўнік 10 класа
Ігнацік М.І.

**18.11.2019**

**Аглядавая інфармацыйная гадзіна "Падзеі, факты, каментарыі»**

*Мэта:* фарміраванне сістэмы ведаў аб палітычных працэсах у краіне і свеце, інстытутах дзяржаўнай улады; засваенне асноў палітычнай культуры.

*Задачы:*
стварыць умовы для выпрацоўкі самастойных уменняў карыстацца інфармацыйнымі рэсурсамі, крытычна ўспрымаць, ацэньваць і аналізаваць інфармацыю, ператвараць атрыманую інфармацыю ў свае веды, супрацьстаяць негатыўным сацыяльна-псіхалагічным уздзеянняў пры рабоце з інфармацыяй.

*Форма правядзення:* інфарм-дайджэст.

*Абсталяванне:*камп'ютары з доступам у Інтэрнэт, палітычная карта свету, нагляднасць: рубрыкі навін, крытэрыі адбору інфармацыі.

*Структура занятка:*
1.Арганізацыя занятка. Пастаноўка задач.
2. Агляд падзей і фактаў, абмеркаванне і каментаванне навін .
3. Работа з тэрмінанамі, паняццямі і г.д., даведнікам "Краіны свету".
4.Рэфлексія
5. Падвядзенне вынікаў. Ацэнка работы.
6. Абвяшчэнне тэмы наступнай інфармацыйнай гадзіны.

*Ход занятка:*

1. Арганізацыя занятка. Пастаноўка задач. Абвяшчэнне формы інфармацыйнай гадзіны.
*Інфарм-дайджэст*- кожнатыднёвая "пяцімінутка" з адвольным выбарам тэм. Кожны вучань знаёміць клас з найбольш цікавымі і значнымі падзеямі за тыдзень з розных інфармацыйных крыніц.

*Паўтарэнне асноўных крытэрыяў адбору інфармацыі:*
- актуальнасць
- аб'ектыўнасць
- значнасць
- дакладнасць
- аператыўнасць
- пераканаўчасць

2. Агляд падзей і фактаў, абмеркаванне і каментаванне навін згодна наступным рубрыкам **(Дадатак 1)**:

• унутраная і знешняя палітыка Беларусі;
• навіны СНД;
• падзеі ў краінах далёкага замежжа;
• навіны навукі, культуры, экалогіі, аховы здароўя, спорту;
• навіны Гродзеншчыны, Дзятлаўшчыны.

Кожны вучань выступае адпаведна рубрыкам з пэўнай інфармацыяй (інфармацыя СМІ, Інтэрнэт-інфармацыя, тэлебачанне), вылучаючы галоўнае; каменціруе інфармацыю, аналізуе і ацэньвае яе, спрабуе даказаць актуальнасць і значнасць.
(Выкарыстоўваюцца магчымасці Інтэрнэта, палітычная карта свету)

3. Работа з тэрмінанамі, паняццямі і г.д. **(Дадатак 2)**, даведнікам "Краіны свету" **(Дадатак 3).**

Праводзіцца работа з новымі тэрмінамі, паняццямі і г.д. (з дапамогай Інтэрнэт-рэсурсаў).
Прапануецца і нфармацыя з даведніка "Краіны свету" (адзін з вучняў выступае з даведкай аб краіне, аб падзеях каторай было паведамленне (форма кіравання, глава дзяржавы, вышэйшы заканадаўчы орган, вышэйшы выканаўчы орган, дзяржаўная мова, рэлігія і г.д.)

4.Рэфлексія (гульня "Бягучая строчка")

Адбываецца гульня "Бягучая строчка" (работа ў парах). Кожная пара павінна памясціць у бягучай строчцы на дошцы самую цікавую і значную навіну, аб якой паведамлялася на занятку.

5. Падвядзенне вынікаў. Ацэнка работы.
6. Абвяшчэнне тэмы наступнай інфармацыйнай гадзіны.

**<u>Дадатак 1</u>**

- Значная падзея знешняй палітыкі Беларусі - візіт Аляксандра Лукашэнкі ў Аўстрыю.
- Савет Еўрасаюза зацвердзіў рашэнне аб падпісанні з Беларуссю візавага пагаднення. У залежнасці ад мэты паездкі шматлікія катэгорыі грамадзян могуць быць і ўвогуле вызваленыя ад выплаты збору і атрымліваць шматразовыя візы з больш працяглым тэрмінам дзеяння ў спрошчаным парадку.
- У ААН прынятая беларуская рэзалюцыя па барацьбе з гандлем людзьмі.
- Беларуская дэлегацыя прымае ўдзел у 40-й сесіі Генеральнай канферэнцыі ЮНЕСКА

- Падтрымай прадстаўніка Беларусі на дзіцячым "Еўрабачанні" і дапамажы сваёй краіне перамагчы ў самым папулярным песенным конкурсе кантынента. 19 краін-удзельніц пройдуць па чырвонай дывановай дарожцы ў холе тэатра ў горадзе Катавіцэ. Наша прадстаўніца на конкурсе Ліза Міснікова прыбыла ў Польшчу. Сам конкурс адбудзецца 24 лістапада.
- 12.11 ў Мінску прайшлі перамовы ўдзельнікаў трохбаковай кантактнай групы па ўрэгуляванні канфлікту на ўсходзе Украіны
- Парламенцкія выбары ў Беларусі. 17 лістапада адбыліся выбары ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі. Цэнтрвыбаркам абвясціў папярэднія вынікі народнага галасавання.
- 17 лістапада – свята сельскай гаспадаркі ў Беларусі
- Прэзідэнт Беларусі правёў нараду па развіцці дражджавой галіны
- Праспект Незалежнасці прызнаны каштоўнасцю сусветнага маштабу
- Кубак свету па канькабежным спорце ў Мінску
- Жаночая зборная Беларусі па баскетболе не пакінула шанцаў Вялікабрытаніі ў сваім першым паядынку ў рамках адбору на чэмпіянат Еўропы 2021 года.

**Дадатак 2**

**ЕС - Еўрапейскі саюз**,у склад якога ўваходзіць 28 краін, якія з’яўляюцца незалежнымі, аднак падпарадкоўваюцца аднолькавым правілам адукацыі, медыцынскага абслугоўвання, прававой сістэмы і г.д. (Не Беларусь, не адна з краін СНГ не ўваходзіць у ЕС)

**ААН - Арганізацыі Аб'яднаных Нацый**. ААН — гэта арганізацыя, у якую ўваходзяць сувэрэнныя дзяржавы. ААН прапануе мэханізм для ўрэгулявання спрэчак ці вырашэння праблем міжнароднага характару, здатны працаваць ва ўсіх сфэрах жыццядзейнасці чалавецтва.

**ЮНЕСКА** - арганізацыя Аб'яднаных нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры). Асноўнымі мэтамі, дэклараванымі арганізацыяй, з'яўляюцца садзейнічанне ўмацаванню міру і бяспекі за кошт пашырэння супрацоўніцтва дзяржаў і народаў у галіне адукацыі, навукі і культуры; забеспячэнне справядлівасці і захавання законнасці, усеагульнай павагі правоў і асноўных свабод чалавека, абвешчаных ААН, для ўсіх народаў, без адрознення расы, полу, мовы або рэлігіі.

**Дадатак 3**

**А́ўстрыя, Рэспу́бліка А́ўстрыя** — дзяржава ў цэнтры Еўропы. На поўначы мяжуе з Чэхіяй, на паўночным усходзе — са Славакіяй, на ўсходзе — з Венгрыяй, на поўдні — са Славеніяй і Італіяй, на захадзе — з Ліхтэнштэйнам, Швейцарыяй і Германіяй.

Афіцыйная мова –нямецкая. Сталіца – Вена. Форма кіравання – Федэратыўная парламенцкая рэспубліка. Федэральны прэзідэнт – Аляксандр Ван дэр Бэлен.

Кіраўніком дзяржавы з’яўляецца Федэральны прэзідэнт, абіраецца на 6 гадоў. Урад узначальвае Федэральны канцлер. Члены ўрада прызначаюцца прэзідэнтам.Парламент Аўстрыі — двухпалатны Федэральны сход, які складаецца з Федэральнага савета і Нацыянальнага савета. Канстытуцыйны суд Аўстрыі — першы ў свеце асобны канстытуцыйны суд (1920). Фарміруецца прэзідэнтам па прадстаўленні ўрада і абедзвюх палат. Мае таксама паўнамоцтвы вырашаць спрэчку паміж землямі (або землямі і федэральным цэнтрам), а таксама выносіць імпічмент вышэйшым службовым асобам.

Чырвоны колер дзвюх палос на сцягу сімвалізуе кроў патрыётаў, пралітую ў барацьбе за свабоду і незалежнасць Аўстрыйскай Рэспублікі. Белы колер — сімвал ракі Дунай, бягучай з захаду на ўсход.